Касуха Н.Ю., студ. гр. 213 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Матвейчык С.В.,
выкладчык

# ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТЭХНІК АЗДАБЛЕННЯ СЯМЕЙНА-АБРАДАВАГА РУЧНІКА КЛІЧАЎСКАГА РАЁНА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці клічаўскага рушніка звязаны з геаграфічным знаходжаннем Клічаўскага раёна – на памежжы Мінскай і Магілёўскай вобласці, мяжа Падняпроўя і Цэнтральнай Беларусі. Таму для клічаўскага рушніка тыповымі з'яўляюцца рысы як падняпроўскага, так і цэнтральнабеларускага рэгіёна.

Клічаўскі раён мае багатую спадчыну тэхнік аздаблення тканіны. Сярод найбольш адметных – бранае ткацтва, шыццё працягам, розныя віды карункаў. Адной з цікавейшых асаблівасцей з'яўляецца бранае двухуточнае ткацтва, якое ў аснове арнамента мела ромбавы малюнак і яго варыяцыі. Улічваючы працаёмкасць бранага ткацтва, яго традыцыйна прымянялі для ўпрыгожвання сіметрычнымі ўзорамі толькі канцоў рушніка, займаючы пры гэтым значную плошчу. Арнамент браных ручнікоў надзвычай разнастайны і багаты, па знешняму выгляду падобны на шыццё працягам. Апошняе характэрна для аздаблення сатканых ручнікоў рамбічнай арнаментыкай. Гатовыя вырабы ўпрыгожвалі карункамі "на клёцках" (каклюшках) ці вязаных шыдэлкам.

Шыццё працягам лічыцца адным з самых старажытных тэхнік аздаблення тканін. У клічаўскіх вырабах упэўнена акрэслены, выразна буйны арнамент са шчыльным рэльефным засцілам з перавагай рамбічнага ўзора. Менавіта графічна - штрыхаваны рамбічны малюнак з'яўляецца прыкладам захавання архаічнага арнаменту.

Каклюшкавыя карункі былі папулярныя да 30-х гадоў XX стагоддзя. Звычайна такі карунак выконваўся баваўнянымі белымі, чырвонымі, чорнымі ніткамі то шчыльным насцілам, то лёгкім скразным перапляценнем.

Вырабляліся карункі толькі для ўласных патрэб. Па шчыльнасці і характару карункі вельмі падобныя да тканай часткі рушніка. Карункі выконваліся паскам у вертыкальнай пазіцыі, што абумовіла іх арнаментальную кампазіцыю – шматразовы паўтор аднаго і таго ж элемента. У структуры аздаблення канца рушніка карункавы пасак займаў гарызантальную пазіцыю, і яго арнамент у спалучэнні з паскамі бранага ткацтва пераўтвараўся ў бардзюр.

Шыдэлкавыя карункі маюць выразны геаметрычны, раслінны ці зааморфны арнамент. Узорныя канцы рушнікоў не вельмі вялікія - 19-40 см, зрэдку сустракаюцца і большыя.

Адной з разнавіднасцей карункаў з’яўляюцца мохрыкі і кутасы, якімі таксама аздабляліся ручнікі з двух бакоў. Уплыў Кіраўскага раёна пашырыў межы аздаблення – з трох бакоў на даўжыню апошняга бардзюра. Такая тасьма з махрамі плялася шляхам абмотвання ніткамі больш-менш вузкай дошчачкі і фіксацыяй кожнага новага павароту асобнай ніцяной пятлёй. Таксама з Кіраўскім раёнам звязана наяўнасць мярэжак – тыповых (слупкамі) і нетыповых (хардангер).

Асобна сярод тэхнік аздаблення стаіць вышыўка крыжыкам і яго разновіднасць “касічка”. Параўнальная лёгкасць і хуткасць выканання вышыванак крыжом з’яўляецца адной з прычын выцяснення старажытных відаў вышывання і ўзорыстага ткацтва. Гэтаму спрыялі і масавыя друкаваныя выданні, якія прапагандавалі кветкавыя ўзоры ў тэхніцы менавіта аднабаковага крыжа. “Цвяцістае вышыванне” – называлі такія вырабы ў в. Паплавы Клічаўскага раёна. Але акрамя больш позняга расліннага арнамента, крыжыкам вышываліся і традыцыйныя геаметрычныя кампазіцыі манахромнага чырвонага колеру.

На канцы XIX стагоддзя тэрыторыя Клічаўскага раёна ўваходзіла ў склад Ігуменскага павета Міскай губерні. Гэта быў адзін з бяднейшых паветаў. Так як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прамысловасць была развіта слаба, то мелі магчымасць захавацца традыцыі стварэння і аздаблення даматканых вырабаў.

Так, напрыклад, захавалася шматбардзюрнасць кампазіцыі з рамбічна-геаметрычным арнаментам на канцах. Шырыня палос ад ніжняга шырэйшага бардзюра паступова змяншаецца ўверсе і пераходзіць у некалькі вузенькіх палосак, якія замыкаюць кампазіцыю. Кожны арнаментальны бардзюр складаецца з пераважна аднаго шчыльнага радка геаметрычных элементаў. Да старажытнага пласта элементаў адносяцца ромбы – простыя і складаныя (з кропкамі, парасткамі, кручкамі, рашоткай унутры, касыя крыжы (свастыка)). Адным з найбольш выразных элементаў з’яўляецца шаснаццаціпялёсткавая разетка.

На мяжы XIX-XX стагоддзяў адбылася трансфармацыя геаметрычнага арнаменту ў раслінны. Так, разеткі і зоркі пераўтварыліся ў кветкі, паўромбы-трохвугольнікі – дапоўніліся паўразеткамі па вяршыням. Сення кветкавыя арнаменты таксама карыстаюцца шырокай папулярнасцю.

Клічаўскі рушнік мае шэраг асаблівасцей тэхнічнага і кампазіцыйнага плана. Рушнік захоўвае традыцыі, якія на жаль могуць быць згубленныя і можа па праву заняць месца “візітоўкі” раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ